Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 11 (604). Wilnia, Niadziela 3 Sakawika 1935 h. Hod XI (XIX).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILŃNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Беларуская рэлігійная праца.

Усе добра ведаем, што рэлігія (Царква і Касьцёл) у нас, замест быць найвышэйшай грамадзкай і культурнай вартасьцяй, сталася сусім чым іншым. Але ў меру таго, як наш народ даходзіць да сваей нацыянальнай сьведамасьці, пачынае ён штораз ясьней разумець, што далей так быць не павінна і дзеля гэтага шукае ён выхаду з цёмнага завулку свайго рэлігійнага жыцьця.

Выхад гэты, як у паглядзе народу, так і ў інтэлігенцыі, дваякі. Адны з беларусаў уважаюць, што раз рэлігія (Царква і Касьцёл), дзякуючы польскасьці і маскоўшчыне, ад беларускага народу закрыта, дык ня трэба з ей мець нічога супольнага. Пагляд гэты сяньня дужа пашыраны і папулярны. Трымаюцца яго ня толькі многія з інтэлігенцыі, але так-жа многія і ў народных сялянскіх гушчах. На гэтых усіх жыруюць камуністы, масоны, розныя іншыя бязбожнікі, а так-жа сэктанты.

Але ёсьць у беларусаў іншы пагляд на выхад з ненармальнага рэлігійнага жыцьця беларускага народу. Пагляд гэты наступны. Уцякаць ад рэлігіі і выракацца яе ня можна, бо раз, што яна чалавеку прыродная і зьяўляецца найвышэйшай вартасьцяй у жыцьці кожнага народу, а другі раз, што калі беларусы адхіляюцца ад Царквы і Касьцёла, дык маскалі і палякі з гэтага толькі далей карыстаюць, а беларусам выходзіць вялікая шкода. Знача, не ўцякаць ад рэлігіі і не бароцца з ей, а — паскольні чалавек можа быць да яе як найбліжэй і змагацца ўсімі дастойнымі спосабамі за тое, каб Царква-Касьцёл у нас ня служылі ніякай палітыцы, каб карысталіся роднай народу мовай і каб гэтым самым былі жывым элемэнтам у беларускай народнай культуры. Словам, да рэлігіі — паводле гэтага пагляду — трэба адносіцца позытыўна і прыхільна; змагацца з польскасьцяй і маскоўшчынай, але не з Царквой і Касьцёлам.

Мы трымаемся ў рэлігійнай палітыцы гэтага другога пагляду, яго пашыраем і за яго змагаемся. Як відаць з дыскусіі, абноўленая БХД так-жа выразна ідзе ў гэтым кірунку.

Але пасьля гэтых агульных уваг запытаемся, ці ёсьць і як канкрэтна выглядае беларуская рэлігійная праца? Нажаль, не заздросна. Калі нямнога робіцца ў беларусаў каталікоў, дык у праваслаўных яшчэ менш.

Праваслаўныя беларусы ў Вільні маюць асобную царкву (пятніцкую), але ў ёй набажэнства бывае дужа рэдка.

Існуе так-жа ў Вільні Беларускі Праваслаўны К-т, але работы ён бадай ня робіць ніякай ані беларускай, ані праваслаўнай. Праўда, сябры гэтага К-ту троха часамі шумяць і крычаць, троха дым пускаюць у вочы сьвяшчэньнікам на эпархіяльных зьездах, але канкрэтнага ня робяць нічога. А найгорш тут тое, што само праваслаўе гэтага Праваслаўнага К-ту дужа сумніўнае. Ёсьць сябры ў гэтым К-це, якія ўсьцяж настроены «ор'ентацыйна»: то на унію, то часам яшчэ на што горшае.

Праваслаўныя беларусы ўрэшце дагэтуль не сарганізавалі ніякага сталага беларуска-праваслаўнага выдавецтва.

Беларускія пропаведзі ў цэрквах, наколькі ведаем, гаворацца толькі нешта ў двух пунктах і то час-ад-часу.

Пяройдзем цяпер да рэлігійнай працы ў беларусаў каталікоў. У Вільні, у касьцеле сьв. Мікалая, ужо больш як дзесяць гадоў стала (за выняткам лета) ў нядзельныя і сьвяточныя дні для беларусаў каталікоў адбываюцца набажэнствы, стала бывае беларускае казаньне і пяе беларускі хор. Існуе Касьцельны К-т, які аб гэтай справе рупіцца.

Ужо восьмы год выходзіць беларускі каталіцкі месячнік «Chryścijanskaja Dumka», якая служыць рэлігійным патрэбам беларусаў каталікоў, будзячы пры гэтым сярод іх так-жа і беларускае нацыянальнае пачуцьцё.

Ад 1929 г. існуе «Беларускае Каталіцкае Выдавецтва», якое старанна рупіцца аб беларускую каталіцкую літаратуру. «Chr. Dumka» і гэта выдавецтва разам выдалі ўжо 30 меншых і большых—беларускіх каталіцкіх кніжак. Сярод іх знаходзіцца малітаўнік «Hołas Dušy», якога вышла нядаўна другое выданьне, лікам тры тысячы.

З беларускімі казаньнямі па касьцёлах на правінцыі справа стаіць нядобра, але лепш, як у праваслаўных. Ведаем, што ў вадным месцы ў касьцеле лацінскім беларускае казаньне гаворыцца пастаянна і ў некалькіх уніяцкіх цэрквах бывае яно даволі часта.

У беларусаў каталікоў, як бачым, хоць мала, але стала і сыстэматычна праводзіцца беларуская каталіцкая праца; у беларусаў-жа праваслаўных канкрэтнага ня робіцца бадай нічога.

Знача, першыя павінны, як гаворыцца, падцягнуцца, а другія павінны хоць раз скрануцца з месца ў кірунку рэальнай, органічнай беларускай праваслаўнай працы. Натуральна, мы ня верым, каб гэткую працу павёў цяперашні Бел. Прав. К-т, які можна разглядаць блізу выключна з боку гумарыстычнага, але хочам верыць, што знайдуцца-ж урэшце сапраўды праваслаўныя беларусы і да таго паважныя людзі, якія стануць да працы на грунце беларускай праваслаўнай культуры.

Ведама, у нашых варунках з падобнай працай, як у каталікоў, так і ў праваслаўных, надта не разгонішся, але ўзноў ня можна-ж і сядзець рукі злажыўшы: трэба рабіць тое, што можна. Прадусім трэба тварыць беларускую, як праваслаўную, так і каталіцкую літаратуру. У сяньняшніх варунках прадусім на гэтым полі павінна праявіцца беларуская рэлігійная праца, як адна з складовых часьцін поўнага адраджэньня беларускага народу.

Пляны ксяндза Сечкі.

У прошлым нумары „Бел. Крыніцы" мы пісалі аб тым, што кажа кс. Сечка аб навароце праваслаўных на каталікоў. Паводле кс. Сечкі, калі праваслаўны наварочваецца на каталіка, то ён стаецца гэтым самым і паляком. Сьцьвярджаючы гэты факт, кс. Сечка заклікае польскія кругі да наварачваньня праваслаўных на каталікоў, каб гэтым пашырыць польшчыну.

Цяпер-жа кс. Сечка ў „Dz. Wil." (№ 49 з 19.II. с. г.) рысуе і пляны гэтакай працы. На самым пачатку ён выразна кажа, што „ксёндз, які працуе пасярод праваслаўных на нашых „крэсах" — гэта праўдзівы польскі(!) місыянар." Потым кс. Сечка падае ўсе труднасьці, якія мае гэтакі польскі місыянар пасярод праваслаўных беларусаў, якія часта з ненавісьцяй адносяцца да польскага ксяндза. Праваслаўныя спачатку быццам выражаюцца так: „Мы цябе заб'ём", „Адыйдзі, а то касою дастанеш", а потым ужо праваслаўныя дзеці быццам кажуць, угледзеўшы ксяндза: „Папа, папа, наш ксёндз ідзе".

Дык першай справай для польскага місыянара, паводле кс. Сечкі, гэта здабыць давер і спагаднасьць праваслаўных. А потым ужо ідуць іншыя спосабы, як: вывучэньне беларускай мовы, пяяньне разам з беларускай моладзяй розных песьняў, наладжаньне сьвятліцаў дзеля сабраньняў моладзі і г. д. Толькі ў гэтай апошняй справе кс. Сечка ня радзіць устройваць „сьвятліцы" на клябаніі, „бо дзеці могуць пакрасьці розныя ксяндзоўскія рэчы і нанясьці вашэй, блох і плюскваў" (так і сказана!).

Пасьля кс. Сечка радзіць кожнаму польскаму ксяндзу мець пры сабе сьвецкую асобу (мужчыну ці жанчыну), якая апроч граматы ўмела-б вясьці і хор, прынамсі на 2 галасы. Такая асоба павінна атрымліваць помач ад усяго польскага грамадзянства і мець грошы, каб часам даць праваслаўным кусочак мыла, абутак або нават і адзежу. Дзеля гэтага кс. Сечка заклікае польскае грамадзянства тварыць спэцыяльныя Камітэты помачы польскім місыйным пляцоўкам. Паводле пляну кс. Сечкі, кожны такі Камітэт павінен выбраць сабе адну такую пляцоўку і нясьці ей помач.

Апроч гэтага, кс. Сечка ўважае, што ў школы для праваслаўнага насельніцтва трэба пасылаць добрых вучыцялёў, якія маглі-б пашыраць з належнымі рэзультатамі праграму кс. Сечкі. Тых вучыцялёў, якія шкодзяць польскаму місыянару, кс. Сечка прапануе высылаць у другія акругі.

На астатак кс. Сечка для праводжаньня сваей праграмы дамагаецца помачы ад ураду і хоць засьцерагаецца проціў ужываньня тэрору і сілы, аднак стаіць за ўвядзеньне новага календара замест старога ў царкоўным жыцьці. Далей цьвердзіць, што праваслаўныя чакаюць толькі „ўказу" ад польскага ўраду, каб перайсьці на каталіцтва. Кс. Сечка быццам сам чуў ад праваслаўных такія сказы: „Каб выйшаў указ перавярнуцца на каталікоў, то ўсе былі-б каталікамі"; „Каб сказалі быць каталікамі, то і былі-б" і г. п. А найлепш кс. Сечка радзіць так рабіць, як яму радзіў нейкі „праваслаўны", а іменна: „У першую пятніцу посту, калі ў мясцовасьці К. будзе фэст, паставіць 2 бочкі водкі, 2 бочкі піва, 2 вазы хлеба, ды каб на гэты фэст прыехалі старшыя ксяндзы і стараста з Маладэчна ды ўсіх запісалі каталікамі, дык галаву даю, што ўсе былі-б каталікамі».

Гэтакі ёсьць апошні спосаб, паводле ксяндза Сечкі, навароту праваслаўных на „польскую" веру!

Уканцы, робячы падсумоўку усіх сваіх праектаў, кс. Сечка кажа: „толькі згоднае супрацоўніцтва ўраду з касьцёлам, грамадзянства каталіцкага і вучыцельства з польскімі місыянарамі можа адрадзіць усходнія землі і вярнуць там каталіцтва і польшчыну".

Як бачым, праграма кс. Сечкі зусім простая: здабыць давер у праваслаўных, упрагчы ў місыйную працу вучыцельства, мець каля сябе давераных асоб, якія нясьлі-б усялякую помач праваслаўным, здабыць для сваей праграмы ўрад, паставіць пару бочак водкі або піва — і праваслаўя няма...

Гэтак гаворыць малады кс. др. Тадэуш Сечка, які прабашчуе недзе каля Маладэчна! Цікава, ці кс. Сечка стасуе ў жыцьці ўсю сваю праграму, асабліва гэты апошні спосаб?

Давялося нам чуць ад аднэй асобы аб падобнай „працы" іншага ксяндза, толькі старэйшага за Сечку, бо аж каноніка, які працаваў паміж праваслаўнымі ў Лідчыне (Мінойты). Вось-жа той ксёндз дзяржаўся гэткай самай праграмы, як і кс. Сечка, толькі ня ставіў водкі ані піва, але даваў кожнаму нованавернenаму з праваслаўя гра-

шовую помач. Рэзультат быў такі, што „наварачваліся“ датуль, пакуль у таго ксяндза хваціла грашэй. Калі ж спынілася матар‘яльная помач, то спыніліся і „навароты“ і гэны ксёндз з Мінойт прыехаў назад у Вільню.

Уважаем, што праграму Сечкаў і ім падобных польскіх місыянараў павінны ведаць ня толькі праваслаўныя беларусы, але і каталікі, і даць ім належны адпор. Бо з праграмы кс. Сечкі мы яшчэ раз бачым, што польскі нацыяналізм не перастае прыбірацца ў каталіцкія пёры, каб нясьці вынарадаўленьне для нашага гаротнага народу. А таксама кс. Сечцы трэба сказаць: „А скінь, воўча, скурку, бо зубкі вiдаць!“ —j—

З царкоўнага пагосту.

Беларуска-Славянскі Лемантар.

П.І.П. (Праваслаўная Інфармацыя Прэсы) падае, што Варшаўская сынодальная друкарня прыступае да другога выданьня падручніка для навучаньня Закону Божага паправаслаўнаму ў беларускай мове, пад назовам: „Беларуска-Славянскі Лемантар і Першая навука Закону Божага.“

Рэдакцыя гэтага падручніка ў другім выданьні даручана Мітрапалітам грам. Сяргею Паўловічу.

Міхалевіч — поп.

П.І.П. падае што Мітрапаліт Дэяніс багаславіў на пасьвячэньне б. дырэктара і вучыцеля Віленскай беларускай гімназіі Ал. Міхалевіча на сьвяшчэньніка.

U sprawie abnaŭleńnia B.Ch.D.

(Dyskusyjny mataryjał).

Wialejščyna. Kala nas usie zahawaryli ab abnaŭleńni B. Ch. D., jak arhanizacyi, jakaja maje za saboj wialikija zasłuhi dla adradžeńnia Biełaruskaha Narodu. Pierahledziŭšy ŭsie dyskusyi, źmieščanyja na bačynach „Bieł. Krynicy“, my pryšli da prakanańnia, što sapraŭdy treba šmat jakija punkty wyprawić i što samaja hałoŭnaja tut sprawa — heta ziamli, katoruju pawinna apracawać Rada B.Ch.D., sklikanaja ŭ swaim časie, a tak-ža wyrašyć źmienu nazowy arhanizacyi. Zaznačajem adnak, što nazowa mienš ważnaja, a najważniejšaja sprawa, kab adpawiedna apracawać prahramu zhodna z wymohami času i patreb Biełaruskaha Narodu.

Budsłaŭ, 27.I.1935 h. *(Podpisy).*

Z dziejnaści Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury.

Žodziški, Wialejskaha paw. Ahulna-siabroŭskaje sabrańnie Žodziškaha Hurtka Bieł. Instytutu Haspadarki i Kultury adbyłosia dnia 10 lutaha 1935 hodu z takim paradkam dnia:

1) Wybary staršyni sabrańnia, 2) adčytańnie pratakołu apošniaha sabrańnia, 3) sprawazdača z dziejnaści hurtka za 1934 h., 4) wybary ŭradu na 1935 h., 5) plan pracy na budučyniu, 6) biahučyja sprawy i wolnyja prapazycyi.

1) Sabrańnie adbyłosia ŭ prysutnaści 20-ci siabroŭ. Sabrańnie adčyniŭ staršynia ŭradu hurtka hr. Janka Čartowič, jaki, pa adčytańni paradku dnia, zaprapanaŭ wybrać staršyniu sabrańnia, padajučy, jak kandydata, Hipalita Sawickaha, na što sabrańnie adnahałosna zhadziłasia. Staršynia sabrańnia, abniaŭšy kiraŭnictwa, paklikaŭ na sekratara hr. Michasia Maroza i prystupiŭ da nastupnych punktaŭ paradku dnia.

2) Pratakoł ahulnaha siabroŭskaha sabrańnia za 1934 hod adčytaŭ sekratar ahulnaha sabrańnia hr. M. Maroz, jaki sabrańnie pryniało da wiedama.

3) Sprawazdaču z dziejnaści hurtka za minuły hod zdaŭ staršynia ŭradu hr. J. Čartowič, z jakoj sabrańnie dawiedałasia, što ŭrad zładziŭ adno pradstaŭleńnie ŭ Žodziškach pad nazowam „Apošniaje spatkańnie“ i adbylisia dwa pasiedžańni ŭradu hurtka. Kasa hurtka maje hatoŭki 58 zł. 45 hr. Siabroŭ naličwajecca 35 asob. Pry hetym było adznačana, što siabry, za wyniatkam niekalkich, nie ŭniaśli jašče siabroŭskich składak. Było pastanoŭlena, kab składki za biahučy hod uniaśli ŭsie abawiazkawa.

4) Urad hurtka na biahučy hod wybrany ŭ nastupnym składzie: staršynia — Andrej Cikota, skarbnik — Anton Babok, sekratar — Michaś Rydziel. U zastupniki: Hipalit Sawicki i Aleksandar Niadźwiecki.

Układajučy plan pracy na budučyniu, pastanoŭlena pieradusim wyrazić padziaku siabrom daŭniejšaha ŭradu hurtka za ich dziejnaść, a tak-ža pastanoŭlena pašyryć aświetu pry pomačy biełaruskich knih i hazet i dziela hetaha pastanoŭlena wypisać bolš biełaruskich hazet.

6) U biahučych sprawach i wolnych prapazycyjach pastanoŭlena wykasawać tych siabroŭ, katoryja nia ŭnosiać siabroŭskich składak. Aproč hetaha siabry wyrazili padziaku haspadyni Paŭlinie Maroz za karystańnie hurtkom z pamieškańnia, a tak-ža wyrazili padziaku byŭšamu staršyni hurtka Janku Čartowiču za jaho pracu ŭ hurtku ŭ praciahu 8 hadoŭ. Na hetym ahulnaje sabrańnie zakončana.

* * *

Centralny Urad Bieł. Instytutu Hasp. i Kultury prypaminaje ŭsim hurtkom Instytutu, jakija dahetul nia prysłali hadawych sprawazdač z swajej dziejnaści, **ab abawiazku prysyłki sprawazdač u jak najchutčejšym časie.**

Беларуская інтэлігенцыя, уважай на вёску!

Хто жывець на вёсцы, працуючы на зямельцы, выціскаючы з яе для жыцьця сокі, той разумее, што сяньняшняе палажэньне нашага сялянства, агулам, вельмі цяжкое. Прадзедаўскія гоні падзелены на дзесяць, а бывае і на дваццаць шнуроў, а гэтыя шнуры чакаюць ізноў новага падзелу на часткі. З гэтага палажэньня трэба шукаць выхаду.

Ня ёсьць выхадам з гэтага палажэньня ані хутарызацыя бяз прырэзкі зямлі, ані тыя рэцэпты на сялянскія хваробы, з якімі падходзяць да сялян казённыя дабрадзеі. Патрэба радыкальных і рашучых зьменаў у валаданьні зямлёю.

Побач з малазямельлем вёскі, якая корчыцца ад недаеду і часта ад галадухі і надмеру рабочых рук, бачыма часта і густа вялізарныя панска абшарніцкія адлогі, гадамі не кранутыя плугам. Побач з такой вёскай раскіданы хутары асаднікаў, шчодраю рукой нагароджаных дапамогамі, але сьвецячыя таксама адлогамі-дзірванамі. Малазямельныя і беззямельныя, лік каторых з кожным годам узрастае, бязсільна спаглядаюць на гэныя адлогі. Гэтым адлогам яны далі-б раду: яны-б іх кранулі на’т дзеравянымі сошкамі і мелі-б з іх карысьць.

Гаротнага сярмяжніка выкарыстваюць: гандляр, пасрэднік, скупліваючы дары ягонае цяжкое працы за бязцэн, і пан-абшарнік, што гэтак танна купляе ягоную сілу і здароўе.

Спробы бараніцца ад вызыску гандляроў, арганізуючыся ў свае сябрыны-коопэратывы, як і ад вызыску працы — нашаму сялянству не ўдаюцца.

Разам з беднатой і галітой нашае вёскі неразлучна шырыцца моральнае зьдзічэньне і сапсутасьць моладзі. Моладзь, шукаючы „пацехі“ у сваім шэрым і цяжкім жыцьці, сьліваецца атрутай-дэнатуратам, продаж якога стала даступная кожнаму. Сьпіваючыся губіць здароў’е, марнуець апошні дабытак і йдзець на злачыны. Нажовыя расправы і зладзейства — зьявішчы на вёсках ня рэдкія і ў большасьці выпадкаў ёсьць вынікамі дзеяньня „чортавага зельля“, якое, да рэчы будзе сказана, — нехта шчодраю рукою дастаўляе на’т у самыя глухія вёскі.

Атручваючыся „чортавым зельлем“, на казённай этыкетцы каторага красуецца грознае прыпамінаньне „memento mori“, траціць здароў’е, часам і жыцьцё, а пападаючы ў варожыя роднай справе арганізацыі запрадае свае душы тым, якім залежыць на нішчэньні ўсяго беларускага і аплёвываньні найвялікшага народнага скарбу — нацыянальнае душы і гордасьці.

Беларуская інтэлігенцыя абязсілена — гэта ведама. Але ў жудаснай праўдзе ня шукайма апраўданьня нашае слабасьці. Нельга сядзець апусьціўшы рукі ў бязсільлі і бязчынна прыглядацца да зьявішчаў, каторымі перапоўнілася наша Краіна. Не забывайма ся аб патрэбе бездакладнае і жывое лучнасьці з гаротным працоўным Народам.

Мы абязсілены, але маема сілу, каб, кінуўшыся ў змаганьне з цёмнымі і варожымі сіламі, бараніць наш сярмяжны Народ і Белую Краіну. А цёмныя й варожыя сілы, што народ наш да згубы давясьці хочуць, хай пераканаюцца ў нашай безгранічнай любові да свайго роднага — беларускага — і гэта будзе нашай перамогай.

Ня толькі са словам пацехі, але дзейным чынам, напружваючы сілы і здвойваючы энэргію — усе да працы з сялянствам для вёскі!

Антон Паддубіч.

ГРАМАДЗЯНЕ! Усе на ніву культуры! Гдзе няма, — арганізуйце гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, а гдзе ўжо заложаныя — узмоцніце ў іх працу!

Wincuk Adważny. 30)

Chłapiec.

POWIEŚĆ.

VII. Śledztwa. *(Praciah).*

Ale tymčasam sam pop Dudziuk uziaŭ sprawu ŭ swaje ruki: pajšoŭ na počtu i daŭ telehramu prystawu Zarazaku, što „dziak lażyć prybity arhanistym da śmierci.“

Wot Zarazaka staŭ pačarodna wyklikać na śledztwa ŭsich patrebnych i kryčaŭ na ŭsich sa ŭsiej swajej siły. Najpierš ksiandzu prykazaŭ wyhnać arhanistaha, kali choča sam astacca ŭ Zawałacy. Paśla Dudziuku prykazaŭ dziaržać dziaka ŭ ryzach. Zachar Dudziuk, choć byŭ wialikim ryzykantam, tut spužaŭsia j sam, bo swaim paśpiecham uwioŭ uładu ŭ pamyłku: napisaŭ ab dziakowaj śmierci, a woś dziak niejkim cudam uziaŭ i ŭstaŭ, i ŭžo iznoŭ staŭ pytacca harełki.

— Jon mianie zaŭsiody mučyć bieskanečna, — kazaŭ pop: — ja ŭžo i sam nia wiedaju, što z im rabić. Nie mahu jaho brać z saboj na Kaladu, ani na druhija treby, bo napjecca zrazu ŭ pieršych chatach, a tahdy paŭzie za mnoj pa cełym miastečku na swaich čatyroch. Prychodzicca pierš jaho dobra „nakačać“ samomu, i tahdy można pakinuć doma. Inakš — niama z im rady!

Sam dziak, Kuźma Narcukiewič, ščyra saznaŭsia ŭ swajej winie: „Winawat, kazaŭ jon, waša błahorodije! niemnożko śliškom potianuł, waša błahorodije! No etomu jezuitu-arhanistamu ja ješčo nie tak dam, waša błahorodije! On ośmiejał majo pienije, „waša błahorodije!“

Arhanistamu Zarazaka prykazaŭ wyjechać z Zawałaki ŭ dwaccać čatyry hadziny. „Čto-by tut i twojeho duchu nie było!“—kryčaŭ Zarazaka.

Arhanisty akuratna spoŭniŭ hety zahad i wyjechaŭ jakraz u dwaccać čatyry... tydni, jak znajšoŭ sabie lepšaje miejsca.

Pośle taho śledztwa stali zapiwać „mirawuju:“ najpierš tolki ŭ čatyroch — prystaŭ, dziekan, pop i ksiondz; adnak pośle, źniuchaŭšy siwuchu, ulez i dziak. Pieršy raz ciapier siadzieli pobač i hawaryli pa-susiedzku pop z ksiandzom. Akazałasia, što jany wychodzili z adnoj hminy, a nawiet razam wučylisia ŭ pačatkawaj škole.

— Nu, dyk za što wam swarycca? — pytaŭsia Zarazaka: — Dudziuk i Marcuk—rodnyja braty.

— Ja nie Marcuk, a Marcinowski, — pierabiŭ ksiondz.

— Hawary, ksiondz, kamu druhomu, chto nia wiedaje, a ja tut načalnik palicyi: usie nitki schodziacca ŭ maich rukach. Ja daŭno wiedaju, što waš baćka nazywaŭsia Marcuk. Što tut hawaryć... lepš wypjem za waša zdaroŭje i za susiedzkuju zhodu.

Ksiondz Marcinoŭski čuć pierš nie razhniewaŭsia, ale dziekan niaznačna šturchnuŭ jaho ŭ bok.

Hutarka wielmi ažywiłasia: usie pawiesialeli, a najbolš sam Zarazaka.

Pili za zdaroŭje sinodu i rymskaha papy i adnym słowam ustroili „sojedinienije cerkwiej.“

— Ja pryznaju rymskaha papu, — kazaŭ pop Dudziuk: — ale staŭlu adzin warunak, kab waš papa pierastaŭ być jezuitam: jezuitaŭ ja nie pierawarywaju! Fu! taki narod...

— Nia treba nijakaha warunku! — kryčaŭ Zarazaka: — niachaj sabie budzie jezuitam. Jezuity — heta narod mudry: jany haworać tolki pałatyni i kożnaha čaławieka widziać naskroś. Ich bajacca ŭsie masony i ŭsia naša matuška Rassija, a jany sabie i ŭ wus nia dźmuchajuć — che, che, che! Ech, kab ja nia byŭ Zarazaka, ja byŭ-by jezuitam!

— Što ž tam jezuit? Niachaj sabie i jezuit! — kazaŭ užo wielmi prydabreŭšy sam pop Dudziuk: — wot ksiondz Michał Marcinoŭski jezuit, a ja jaho pacałuju!

Tut ksiondz z papom tak krepka pacaławalisia, što až papadźja wyhlanuła z kuchni, dumajučy, što jznoŭ pajšli aplawuchi.

— A ja ŭsiotyki zhody nie daju! — skazaŭ dziak Kuźma.

Prykusi jazyk, dziača! — zahamaniŭ na jaho prystaŭ: — tut twajej zhody nichto nia pytaje.

— Wy sabie nia pytajcie, — ćwiardziŭ swajo dziak: — a ja zhody nie daju, bo jezuity — heta takija... heta...

Ale Zarazaka nia daŭ jamu skončyć, łoŭka schwaciŭ jaho za karšeń i wyturyŭ z kuchni. I tam dziak dakončyŭ swajo słowa.

— ...jezuity... heta... heta... Jezuity, jak wiedźmy, majuć zzadu chwościki. Jany ciabie mohuć zarezać wot tut, na hetym miejscy, a pośle ciabie żywoha źjaduć, a ty, brat ty moj, maŭčy, bo ty nie jezuit! Jezuity pradajuć u kaściele indulhiencyi, tak jak my świečki; a pośle jany tyja indulhiencyi palуć pierad aŭtarom, zamiesta świečak. Wot chto jezuity! Ja ŭžo daŭno ich raskusiŭ, bo ja taki samy chitry, jak i jezuity. Tolki ž ja sprawiadliwy čaławiek — ja nawiet małoha dziciaci nia skryŭdžu. A wot naš prystaŭ Zarazaka — jezuit! Jaho murawanski dziekan jašče letaś zapisaŭ u jezuity i za heta jamu doraha płacić. I naš pop Zachar Dudziuk, taksama siahodnia zapisaŭsia ŭ jezuity. Che, che! jon dumaje, što ja hetaha nie paniaŭ. A ja zrazu zmiarkawaŭsia, čym tut pachnie, i stoj— nazad! Jany tut mianie chacieli napužać... Nia tak to jano lohka! — Staruju waronu żydam nie nastrašyš! A zaŭtra ja napišu ŭ kansystoryju, a pośle zaŭtra ŭ samy sinod — wot, jak ja zrablu! Bo chto-ž budzie baranić carkwu ad sabłaznu, jak nia ja — Kuźma Narcukiewič, ha? O, ja znaju, z katoraha kanca rakoŭ jaduć! A papa Dudziuka sašluć tudy, hdzie i Makar cialat nie paświŭ, jak kaliści sasłali jahonaha dzieda za wuniju: tahdy jon paznaje, jak pisacca ŭ jezuity“!..

Biednaja papadźja, pačuŭšy heta, tak i spaławieła, pośle źbialeła, pośle ščarnieła i... jak kryknuła — tak i samleła. Zrabiŭsia stuk-hruk: słuha ŭbiehła da haściej klikać papa; pop skočyŭ ratawać żonku. Dziekan prykazaŭ padać koni i pajechaŭ u Murawanku. Ksiondz Marcinoŭski pašoŭ damoŭ. Zarazaka abapiorsia na kanapu i zachrop na ŭsie zastaŭki. A dziak paploŭsia da Šlomy. — Wiedaješ, Šloma, kazaŭ jon, kab nia ja, dyk siahodnia naš pop padpisaŭ-by wuniju, ale ja nie dapuściŭ!

— Nu!... — skazaŭ Šloma, i bolš ničoha nie skazaŭ.

— Tak i nie ŭdałosia sojedinienije cerkwiej. Kab nia Kuźma Narcukiewič, dyk chto jaho wiedaje, što tam było-by? A tak...

Što zdabyli litoŭskija sialanie za 17 hadoŭ niezaležnaści Litwy.

„Musu Artojas“ Nr. 4 z 23.II. siol. h. z nahody 17-lećcia Niezaležnaści Litwy źmiaščaje cikawyja fakty ab tym, što palityčnaja niezaležnaść hetaj krainy dała sialanstwu. Woś što ab hetaj sprawie piša ŭspomnieny časapis:

...„Niezaležnaja Litwa pradusim nadzialiła ziamloj biezziamielnych i małaziamielnych sialan, katoryja baranili swaju Baćkaŭščynu, pamahali zdabywać jej swabodu. Ziamli-ž dla nadziełu chapała. Heta byli ziemli tych, katoryja jašče za časoŭ panščyny spyniali litoŭskuju kulturu i narodnuju pracu, katoryja imknulisia da taho, kab litoŭskich sialan wynaradawić i nažywacca z ich pracy. Ad ich, wolnyja litoŭskija sialanie, swaje adwiečnyja ziemli wiarnuli sabie nazad i padzialili. Takoj ziamli (aromaj, łuhoŭ i lasoŭ) akazałasis 1.670.000 ha. Nadzieleny jej byli pradusim biezziamielnyja achwotniki ŭ wajnie za niezaležnaść Litwy. Da 1927 h. ziamlu atrymali 27.000 biezziamielnych. Apra-ča hetaha, praz hety ž samy čas, niekalki dziesiatkaŭ tysiač sialan małaziamielnych pawiali̇čyli swaje haspadarki na 2—10 ha ziamli, jakuju atrymali z zabranaj ziamli dwarom.

Centry dwaroŭ byli papradawany litoŭcam, katoryja mahli wieści wyšejšuju haspadarku. Takich dwornych centraŭ da 1928 h. było pradana 150 z płoščaj 6.600 ha ziamli.

Padzieł dwaroŭ išoŭ wobak z raźbiŭkaj sioł na chutary. Chutaryzacyja adbywałasia na košt dziaržawy. Apra-ča hetaha, sialanie, pierajšoŭšyja na chutary, zwalnialisia ad padatkaŭ, atrymliwali hrašowyja zapamohi na zabudawańnie, a tak-ža zapamohi drewam, ziarnom i h. d. Da 1929 h. raździelenych na chutary było 2550 sioł z płoščaj ziamli 559.900 ha. U hetym hodzie raździeł na chutary budzie zakončany. Takim čynam u 1936 hodzie ŭ Niez. Litwie siołaŭ užo susim nia budzie. Da 1928 h. nowym sialanskim haspadarkam i pašoŭšym na chutary dziaržawa dała da 40 miljonaŭ litaŭ, jak doŭhaterminowuju pazyku na ŭparadkawańnie haspadarak.

Razam z hetaj rabotaj była raspačata dasuška łuhoŭ, paloŭ i bałot. Da 1933 h. było asušana 275,000 ha i zdrenawanych da 4000 ha paloŭ i łuhoŭ. Na hetyja raboty dziaržawa wydała da 20 miljonaŭ litaŭ. Znača, asušku hetu dziaržawa faktyčna prawiała na swoj košt.

Z hetaha bačym, što ŭłada Niez. Litwy pradusim nadzialiła sialan ziamloj, a paśla pačała henuju ziamlu palapšać. Rabota kala palepšańnia ziamli adbywajecca ŭ wa ŭsich halinach. Apra-ča asuški i drenawańnia dajecca sialanam padmoha dobrymi ziemlarobskimi pryładami, žywiołaj i nasieńniem. Razam z hetym wučać sialan kulturna haspadaryć. Dla hetaj mety ŭ kožnym pawiecie jość ahranom i razam z im niekalki adumysłoŭcaŭ-instruktaroŭ. Apra-ča hetaha ŭ centrach pawietaŭ i hmin arhanizujucca ziemlarobskija škoły, u jakich sialanie wučać haspadarki swaich dziaciej, budučych haspadaroŭ. Apra-ča hetaha paŭstajuć uzhadawaŭčyja arhanizacyi, pradusim siarod maładych haspadaroŭ, jakija majuć na mecie pryśpiašyć kulturnuju haspadarskuju pracu. Da hetkich arhanizacyjaŭ usie achwotna hornucca, asabliwa moładź, bo bačać u ich wialikuju dla siabie karyść. Za čatyry apošnija hady da takich arhanizacyjaŭ naleža da 16.000 moładzi.

Apra-ča ŭsiaho hetaha siarod litoŭskich sialan šyroka raźwiwajecca kooperacyja. Spažywieckich kooperatywaŭ dahetul naličajecca da 500, małačarskich da 400 i pazyčkowa-aščadnickich da 200. Paasobnyja haliny kooperacyi majuć swaje centry, abaroty jakich siahajuć niekalkich miljonaŭ litaŭ...

Ahułam kažučy, treba ściwierdzić, što sialanie ŭ Niez. Litwie ŭziali ŭ swaje ruki pierapracoŭku ŭsich swaich wyrabaŭ, a tak-ža i pradažu ich...

I woś, Niez. Litwa, nia majučy swaich kapalniaŭ wuhla, hazy, žaleza i soli, a majučy tolki apuščanuju ziamlu z biednymi sialanskimi haspadarkami, praz 17 hadoŭ patrapiła tak pryhoža ŭparadkawacca, tak padniacca kulturna i pabahacieć, patrapiła ŭtrymać swaju armiju, tysiačy škoł, uradaŭcaŭ, patrapiła prawieści čyhunki, šosy, kupić marskija karabli i h. d.“—

Hetak maluje „Musu Artojas“ haspadarčaje pałažeńnie u Litwie za 17 hadoŭ jaje niezaležnaści. I heta ŭsio całkom zrazumieła, bo niezaležnaść kožnaha narodu — heta pieršy najważniejšy warunak jaho naležnaha razwoju i dabrabytu.

P. Ł—č.

Paśla pramowy ministra Kaściałkoŭskaha.

Pramowa ministra Kaściałkoŭskaha, skazanaja z trybuny senackaj kamisii, ab jakoj my pisali ŭ prošłym numary „B. Kr.“, wyrazna pajaśniaje polskuju ŭnutranuju palityku ŭ adnosinach da nacyjanalnych mienšaściaŭ, asabliwa da mienšaściaŭ terytoryjalnych: Ukraincaŭ, Biełarusaŭ i Litoŭcaŭ.

Kab lepš zrazumieć źmiest henaj ministerskaj pramowy, treba zahlanuć u źmiest pramowy ukrainskaha pradstaŭnika, senatara Makucha, katoraha pramowa wyklikała zwaroty min. Kaściałkoŭskaha da Ukraincaŭ. Źmiest pramowy senatara Makucha, u skaročańni, hetki:

Adnosiny „narodnaha“ abozu da ukrainskaha narodu — jasnyja: niama Ukrainy, jość tolki Polšč i Rasieja. Adnosiny panujučaha abozu niajasnyja. Inakš było kaliś, a inakš ciapier. Narodny aboz staić na stanowiščy, što polskaja dziaržawa jość nacyjanalnaj dziaržawaj, a rešta — niapolskija nacyjanalnaści — tolki tolerujecca, adnačasna imknučysia da ich denacyjanalizacyi. Nacyjanalnyja mienšaści ŭ Polščy musiać źniknuć. Pytańnie tolki, jakija dziela hetaha zastasawać sposaby. Panujučy aboz, choć i nie piareča isnawańniu nacyjanalnych mienšaściaŭ u Polščy, ale imkniecca da toj samaj mety, što i narodny aboz. Panujučy aboz zajaŭlaje, što nia imkniecca da etničnaha wynaradaŭleńnia mienšaściaŭ, ale imkniecca da abadrańnia ich z ich palityčna-nacyjanalnych ideałaŭ i zmahańniaŭ da samastojnaha, nacyjanalnaha raźwićcia. Da namiečanaj mety panujučy aboz idzie roznymi šlachami i sposabami...

Dalej senatar Makuch hawaryŭ ab Berezie-Kartuskaj i ab polskaj palicyi.

Na hetu woś pramowu i byŭ zwarot min. Kaściałkoŭskaha da Ukraincaŭ, jakija reprezentujuć u polskich zakonadaŭčych pałatach ukrainski narod, što znachodzicca ŭ sučasnych hranicach polskaj dziaržawy.

Hetkaja pramowa kiraŭnika polskaj unutranaj palityki—ministra ŭnutranych spraŭ achaładziła dumku ab idejnaj uhodzie naiŭnych palitykaŭ terytoryjalnych nac. mienšaściaŭ u Polščy. Nie achaładžwaje jana tolki palitykaŭ, što dziejuć tak, jak redaktary „Роднага Краю“ ŭ Wilni.

Nowaje asadnictwa.

Hazety padajuć: skora koštam Fondu Pracy, na ukrainska-biełaruska-litoŭskich ziemlach budzie pasielena 250 siemjaŭ biezrabotnych i ramieśnikaŭ z Polščy. Hetyja asadniki majuć być pasieleny ŭ wajawodztwach: Wałynskim, Nawahradzkim i Wilenskim.

Asadniki atrymajuć kredyty — na kuplu ziamli, — jakija buduć spłačywać praz 50 hadoŭ. Z Dombrowy ŭžo wyjechała na Wilenščynu 20 siemjaŭ biezrabotnych.

Ci żywie Branisłaŭ Taraškiewič?

Paśla apublikawańnia wiestak ab rastralańni Br. Taraškiewiča, Rak-Michajłoŭskaha i I. Dwarčanina — sawieckaje ahienstwa (TAS) lakanična zapiarečyła: — Taraškiewič u Miensku nie rastralany. Paśla hetaha, žonka Br. Taraškiewiča apublikawała ŭ wilenskich hazetach piśmo, što jaje muž — Br. Taraškiewič — žyŭ, zdaroŭ i pracuje ŭ Maskwie, jak **ekanamist.**

I što za ironija — z filoloha — ekanamist!?—Ab Rak-Michajłoŭskim i I. Dwarčaninie nichto nie skazaŭ, što ich balšawiki „nie uničtožili“.

Palityčnyja maneŭry.

Francuska-anhielskaje parazumieńnie, ab jakim my niadaŭna pisali, wyklikała šyrokaje zacikaŭleńnie i wialikaje palityčnaje zawarušeńnie. Pačałasia wialikaja dyplomatyčna-palityčnaja ihra, jakaja adbywajecca ciapier miž Paryžam—Londynam—Berlinam—Maskwoj.

Cikawaje pałažeńnie: Z adnaho boku imkniecca Niamieččyna nawiazać suadnosiny z Anhlijaj, a z druhoha boku ŭpływy Francyi ŭ Londanie takija, kab Anhlija nie zrabiła ani adnaho palityčnaha šahu biaz Francyi, jakaja ŭ dalejšaj ihry maje za saboj Sawiety. Z hetaha widać, što adbywajucca padwojnyja palityčnyja maneŭry — niamiecka-anhielskija suproć francuska-sawieckich. Anhlija chistajecca i niawiedama, kudy pierachilicca. Sawiety wiedajuć, što kali budzie anhielska-niamiecka-francuskaje parazumieńnie, dyk Sawiety astanucca biaz Francyi i hety sajuz moža być nakirawany suproć Maskwy. Ciapier woś ab hetym i naradžajucca dyplomaty hetych eŭrapejskich dziaržaŭ.

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА.

Праца над чысьцінёй беларускай мовы. Апошняя зборка працаўнікоў над чысьцінёй беларускай мовы адбылася 25 лютага ў залі Бел. Інст. Гасп. і Культуры ў Вільні. Наступная зборка адбудзецца 11 г. м. У наступным нумары пачынаем друкаваць працы гэтых зборак.

З выдавецкае нівы. Выйшлі з друку: „*Беларуская Борць*“ № 1—2 (6—7), студзень-люты, 1935 г., месячнік пчалярства і мядова-лекарскіх зёлак. Гэты сымпатычны часапіс мае 16 бачын, фармату васьмёркі.

„*Пралескі*“ *№ 2*, 1935 г., месячнік для дзяцей.

„*Dadatak da katalohu*“ Беларускай кнігарні „Пагоня.“

Суд над беларускай прэсай. У Віленскім акружным судзе 28 г.м. адбудзецца апэляцыйны суд над рэдактарам нашай газэты—Я. Пазьняком і рэдактарам „Новага Шляху“—Ул. Казлоўскім за артыкулы сканфіскаваных нумароў гэтых часапісаў.

Агульны гадавы сход Віл. Аддзелу Бел. Інстытуту Г. і К. адбудзецца ў аўторак 5.III. г. г. а гадз. 6 веч. у кватэры Інстытуту. Прысутнасьць усіх сяброў абавязкавая.

З студэнскага жыцьця.

— 24-га лютага адбыўся гадавы сход сяброў Т-ва Беларусаведы пры віленскім унівэрсытэце. Сход выслухаў справаздачу ўступаючага ўраду т-ва, выразіў яму абсалюторыю і выбраў новыя ўлады т-ва. У склад новага ўраду т-ва ўвайшлі: В. Тумаш — старшыня, А. Махонька — віцэстаршыня, П. Засім—сэкратар, Т. Мацьвеева — скарбнік і І. Будзьчанка—вольны сябра; у Рэвізыйную Камісію т-ва ўвайшлі — В. Войтэнка—старшыня, М. Шчорс і Я. Бурак — сябры

—Дня 3-га г. м. у залі VI-й галоўнага будынку унівэрсытэту адбудзецца чарговая навуковая зборка Т-ва Прыяцеляў Беларусаведы з рэфэратам Б. Стэповіча. Пачатак а гадз. 17-ай.

— 17.III адбудзецца агульны сход сяброў Беларускага Студ. Саюзу, з справаздачамі ўступнага Ураду і Рэвіз. Камісіі, і выбарамі новага Ураду і Рэв. К. Саюзу. Сход адбудзецца у залі VI й галоўнага будынку унівэрсытэту. Пачатак а гадз. 15-й.

—На аддзеле славянскае філёлёгіі віленскага унівэрсытэту праф. Э. Кошмідар выкладае ў бягучым акадэміцкім годзе беларускую мову паводле праграмы: 1) гістарычная граматыка беларускае мовы—2 гадз. у тыдзень (аўторкі і пятніцы 8—9 гадз.), 2) чытаньне беларускіх тэкстаў—і ацэнка сэмінарыйных працаў 2 гадз. у тыдзень (пятніцы 9—11 гадз.). Ня трэба гаварыць, што ўсе студэнты Беларусы павінны прысутнічаць на гэтых выкладах.

—VI-ты гадавы баль Студэнскіх Саюзаў: Беларускага, Літоўскага і Украінскага адбудзецца ў Вільні ў суботу 2-га сакавіка сёлета, у залях Музычнае Консэрваторыі (Конская 1). Пачатак а гадз. 22.

Roznyja wiestki.

Z POLŠČY.

Zahad samaŭradam ab aščadnaści. Ministerstwa ŭnutranych spraŭ zahadała samaŭradam rabić aščadnaści, u wydatkach na hramadzkija arhanizacyi. Samaŭradam zabaraniajecca źbirać „dabrawolnyja“ apłaty ŭ formie pradažy značkoŭ hramadzkich arhanizacyjaŭ.

Nowaja wybarnaja ordynacyja. Polskaja presa padaje, što pawadyry BB naradžajucca nad prajektam nowaj wybarnaj ordynacyi i majuć pryniać pastanowu, kab palityčnyja partyi nie mahli wystaŭlać kandydataŭ u pasły. Pakulšto jašče nie ŭstanoŭlena, chto maje padawać pasolskija kandydatury—samaŭrady, haspadarčyja arhanizacyi ci inšyja, majučyja nadzor z boku administracyjnych uładaŭ.

Abnizili canu manapolki. Hetymi dniami skarbowyja ŭłady abnizili canu manapolnaj harełki.

Biezraboćcie raście. Wa ŭsiej Polščy 23 lutaha było 517.476 biezrabotnych. Za apošni tydzień biezrabotnych prybyło 2.135 asob.

Z ZAHRANICY.

Abisynija nia ŭstupaje Italii. Afryka pačynaječ baranicca ad eŭrapejskich najezdnikaŭ. Abisynija suproć damahańniaŭ Italii staić na stanowiščy abaronnym i nia ŭstupaje. Italija pačała tudy, u Afryku, pasyłać wojska, hroziačy hetak wajnoj. Ale Abisynija maje swaich pryjacielaŭ. — Japonski ambasadar u Rymie zajawiŭ, što ŭ wypadku wajny Italii z Abisynijaj Japonija budzie pamahać Abisynii.

Kitajcy wyhaniajuć eŭrapejcaŭ. Hazety padajuć: kitajskija ŭłady nie abnaŭlajuć užo kontraktaŭ z techničnymi daradčykami, a tak-ža i z daradčykami ŭ halinie finansawaj i handlowaj. Hetkimi daradčykami dasiul byli ŭ Kitaju eŭrapejcy. Ciapier majuć być japoncy.

Nowy tytuł Stalina. Rasieja zdaŭnych bahata abdarała swaich despotaŭ roznarodnymi tytułami: wieličestwo, wysočestwo, sijatielstwo, prewoschoditielstwo i h. d. Rewalucyja hetyja tytuły skasawała. Balšawiki, asabliwa dla Stalina, pačali nanowa prydumywać tytuły: śpiarša Stalina nazywali — wielikij woždź, naš ulublenyj, naš odinokij, gienijalnyj i h. d., a ciapier, — apošni źjezd Sawietaŭ nazwaŭ Stalina — „gienij ludztwa“!

Z KRAJU.

Padziamielle wydała brašuru „Asadniki“. Wilenskaja polskaja hazeta „Słowo“ padaje, što na terytoryi Wilenskaha wajawodztwa raspaŭsiudžana, nielehalna wydanaja, pabiełarusku nadrukawanaja brašura, pad nazowam „Asadniki“. Hetaja brašura, jak ćwierdzić hazeta „Słowo“, maje źmiest prociŭ Polščy i padburaje da adarwańnia Wilenščyny ad polskaj dziaržawy. „Słowo“ dahadwajecca, što heta brašura wydana ŭ Koŭnie, a raspaŭsiudžwajuć jaje byccam siabry Kowienskaha Sajuzu Wyzwaleńnia Wilni.

Z WILJNI.

Kanfiskata litoŭskich hazet. Zahadam haradzkoha starasty skanfiskawany: „Viln. Ryt.“ Nr. 16 za chronikarskuju zaciemku: „Adhałoski dnia 16 lutaha“ i „Viln. Žodis“ Nr. 5 za artykuł: „My adkazny nia tolki prad sučasnaściaj, ale tak-ža i prad budučyniaj.“

240352

№5(16). СТУДЭНСКАЯ ТРЫБУНА 3.III.35.

ПЕРАД ВЯЛІКІМ СЬВЯТАМ.

Надыходзіць урачысты і сьвяты дзень 25 сакавіка — дзень угодкаў абвешчаньня дзяржаўнай незалежнасьці Беларускага Народу. Беларуская студэнства ад першага праблеску адраджэньня заўсёды было кузьняй самастойніцкай і незалежніцкай думкі, заўсёды прымала удзел у працах рожных легальных ці нелегальных арганізацыяў і выпушчала з сваіх радоў людзей, якія для дабра Бацькаўшчыны самі жыцьцё сваё аддавалі.

Дык няхай-жа ў будучыне не засьне ў грудзёх беларускага студэнства іскра любові Бацькаўшчыны, а думка незалежніцкая няхай крысталізуецца і прыймае канкрэтныя формы!

Культурна-бытавыя і матарыяльныя ўмовы жыцьця студэнства ў Савецкай Беларусі.

У восені мінулага году грам. Клім, каторы вярнуўся летам з Саветаў пасьля доўгага там прабываньня, на зборках так зв. „Пятнічных" у Бел. Інст. Гасп. і Культ. зрабіў некалькі дакладаў аб жыцьці ў Саветах. Паміж іншым успомніў у іх і аб жыцьці студэнскім, прадстаўляючы яго ў дрэнных колерах. Да дакладаў грам. Кліма нікаторыя з слухачоў мелі засьцярогі, закідаючы дакладчыку тэндэнцыйнасьць у прадстаўляньні савецкага жыцьця.

Ніжэй паданыя матарыялы, якія перадрукоўваем з савецкай афіцыяльнай прэсы, засьцярогі гэныя аб тэндэнцыйнасьці дакладчыка зусім касуюць і пацьвярджаюць, і дапаўняюць тое, што сказаў грам. Клім.

Што-ж гавора студэнства Савецкай Беларусі аб сваім жыцьці, у асобнасьці культурна-бытавых і матарыяльных умовах жыцьця, а так-жа комуністычны офіцыёз „Звязда", выходзячы ў Менску? Сапраўды самыя жудасьці.

У нумары 3 „Зьвязды" з 3.1.35 знаходзім надрукаванае пісьмо нейкага А. Манько, студэнта Клімавіцкага Зоотэхнікума, які піша аб бытавых умовах студэнства так:

„Студэнты Клімавіцкага Зоотэхнікума знаходзяцца ў надзвычай дрэнных бытавых умовах, што перашкаджае нармальнай вучобе. Інтэрнаты перагружаны, у некаторых пакоях тапчаны стаяць ушчыльную і такім чынам студэнты сьпяць пад адной коўдрай. Многія студэнты прыехалі ў тэхнікум без пасьцельных прылад і дырэкцыя ім не дапамагае. У інтэрнатах адсутнічаюць самыя неабходныя рэчы, як рукамыйнікі; няма таксама ў інтэрнатах патрэбнай кольнасьці сталоў, табурэтак. Лекцыі рыхтаваць прыходзіцца лежачы на ложку. З-за гэтых прычын студэнты на лекцыі прыходзяць непадрыхтаванымі. Сталовая працуе зусім дрэнна. На 180 студэнтаў ёсьць толькі 20 талерак; лыжак зусім няма. Якасьць харчаваньня дрэнная, малая каларыйнасьць, меню не зьмяняецца ўвесь год. У аўдыторыях холадна; студэнты і выкладчыкі на занятках сядзяць у польтах, з прычыны дрэнных умоў наглядаецца масавы адсеў студэнтаў новага набору".

А.М. Вішнеўскі, карэспандэнт „Звязды", у гэтым-жа нумары піша аб Клімавіцкім тэхнікуме так:

„Клімавіцкі тэхнікум рыхтуе Зоатэхнікаў для раёнаў з ведамі па пчалярству, як дадаткавай спэцыяльнасьці ў сельскай гаспадарцы. Падрыхтоўцы спэцыялістаў па жывёла-гадоўлі партыя і ўрад аддаюць зараз выключную ўвагу.

У якіх-жа ўмовах знаходзіцца Клімавіцкі Зоотэхнікум?

Прашло ўжо больш двух месяцаў вучобы, а ў інтэрнатах тэхнікума няма сталоў, табурэтак, у інтэрнатах адсутнічае малейшая ўтульнасьць, у пакоях брудна і цесна. Рыхтаваць лекцыі студэнтам прыходзіцца лежачы на ложках. У большасьці студэнтаў няма пасьцельнай бялізны. Адсутнічаюць у дастаткавай колькасьці сталы і крэслы і ў аўдыторыях. Часта заняткі студэнты праводзяць стоячы. Чаму няма абсталяваньня для аўдыторыі і інтэрнату ў тэхнікуме? Вось што аб гэтым гаворыць дырэктар тэхнікума Чычко і яго намесьнік Бачурын. — Абсталяваньне было заказана у Барысаве 1 ліпеня, якое к 1 верасьня было ўжо гатова Для перакідкі яго ў Клімавічы патрэбны два вагоны, але нам іх не даюць. —

У сталовых на 180 студэнтаў ёсьць толькі 20 талерак. Кухня брудная з праваленай падлогай. Павары працуюць без халатаў. Нават лыжак ня могуць дастаць, у той час, як у самых Клімавічах працуе арцель вырабляючая лыжкі.

Снабжэньне студэнтаў вельмі дрэннае. Акрамя 600 грамаў хлеба, які Клімавіцкае гарно выдае з вялікімі перабоямі, студэнты больш нічога не атрымліваюць. Абеды ў сталовай заўсёды посныя, аднаго стандарту. Зараз сталовая ня мае ніякіх запасаў прадуктаў, жывуць, як кажуць сёняшнім днём. Стыпэндыю студэнтам не выплачываюць па два месяцы. Гэтыя сродкі скарыстоўваюць на іншыя патрэбы...

Цікава прывесьці такі факт. Студэнты першага курсу трэцяй групы заключылі соцдагавор, у які ўнесьлі пункт з патрэбаваньнем ад дырэкцыі палепшыць іх бытавыя ўмовы. Дырэкцыя тэхнікума расцаніла гэта, як „апартунізм,"няўменьне перамагаць „нашыя труднасьці." Як вынік такога дрэннага матар'яльнага бытавога становішча студэнтаў і бяздушных бюракратычных адносінаў дырэкцыі тэхнікума і Клімавіцкіх раённных арганізацый— у тэхнікуме наглядаецца вялікі адліў студэнтаў. Так на першы курс было прынята 72 чалавекі, зараз засталося толькі 44.

Нельга абыйсьці і таго, што ўсе выкладчыкі ў тэхнікуме выкладаюць дысцыпліны выключна на рускай мове. Аб беларусізацыі тут і ня думаюць"....

„Звязда" № 4 з дн. 4.1.35 г. робіць агляд пісем студэнтаў і сьцьвярджае, што... „Пісьмі, паступіўшыя ў рэдакцыю, сігналізуюць, што ў радзе... навучальных устаноў, у прыватнасьці ў сельска-гаспадарчых тэхнікумах, ня створаны самыя мінімальныя, самыя элемэнтарныя ўмовы для работы і адпачынку студэнтаў.

У Брагінскім зоотэхнікуме навучаецца 200 студэнтаў. Яны пастаўлены зусім у немагчымыя ўмовы для вучобы. У лабораторыях тэхнікума не хватае лавак і табурэтак, няма на чым сядзець. Дзьверы не зачыняюцца, бо няма ручак і клямак. На 200 студэнтаў ёсьць адзін бак для піцьця вады. У часе перапынку вакол бака зьбіраецца вялікая чарга. Мала таго, што толькі адзін бак, вада з кранта цячэ слаба і ёсьць толькі адна кружка на ўсіх.

Такое становішча ў вучэбных памешканьнях. Ня лепшае ў інтэрнаце. Ёсьць інтэрнат на 100 чалавек, пакояў і перагародак у іх няма. Вокны выбіты, падлога дзюравая. „Сьцены — як піша студэнт — усьміхаюцца вуліцы."

Сядзець няма гдзе і студэнты валяюцца на ложках. Няма ўмывальніка, вешалкі. Вопратку студэнты кладуць пад падушкі" (Пісьмо студ. Дзянісава).

У сталовай тэхнікума: — „Кладоўшчык сталоўкі тэхнікума Камбалаў папсаваў некулькі бочак гуркоў і капусты. Гэтымі прадуктамі ён снабжае сталоўку. Былі выпадкі, калі работнікі кухні катэгарычна адмаўляліся рыхтаваць стравы з гнілых прадуктаў. Сталы ў абедзенай залі заўсёды брудныя, на начыньні накапілася гразі на цэлы сантымэтр. Штат сталовай так падабраны, што як—быццам усе няздольныя людзі, усе неўдачнікі Брагіна сабраліся сюды"...

„Калі студэнт Шаклевіч на агульным сходзе сказаў (дырэктару тэхнікума Тачылаву) аб дрэнных культурна-бытавых умовах студэнтаў, то Тачылаў адразу наваліўся на яго: „Хто так гаворыць, той не большэвік, а ныцік. Трэба біць такіх людзей."

Пасьля такой безапаляцыйнай заявы дырэктара, ніхто больш не адважыўся крытыкаваць парадкі ў тэхнікуме" (пісьмо студ. Барсукова).

„Больш двух месяцаў працуе ўжо школа трактарных брыгадзіраў пры Гарадоцкім сельска-гаспадарчым тэхнікуме, навучаецца у ёй 40 чалавек. Але заняткі дагэтуль не наладжаны. То сьвятла не бывае і нельга займацца, то настаўнікі не зьяўляюцца на лекцыі. Ад гэтага зрываецца навучальны плян". Жыцьцё ў інтэрнаце: — „Памешканьне да зімы не падрыхтавана: праз сьцены дзьме холад, у пакоях заўсёды цёмна, нельга рыхтавацца да заняткаў, ніхто ня думае пашыць матрацы...

Дырэктар курсаў таварыш Жучко і загадчык гаспадаркі Якімаў бытам курсантаў не цікавяцца. Такое становішча ў школе. Ня лепшае і ўсамым тэхнікуме" (пісьмы курсантаў Піменава, Цьвярдова, Шабуні).

„Ня створаны нармальныя ўмовы для вучобы і ў Смілавіцкім сельска-гаспадарскім тэхнікуме. Няма ані аднэй цёплай утульнай аўдыторыі—усюды холадна, падвойныя рамы не ўстаўлены. У аўдыторыі матэматыкі абоі пакрыліся ад сырасьці грыбкамі і адваліваюцца ад сьцен. Дырэктар тэхнікума Матусэвіч ніякай увагі не зварачвае на заявы студэнтаў, на сыгналы сьценгазэты" (пісьмо М. Шыліна).

„Звязда" № 36 з дн. 12.II.35 г. друкуе пісьмо з подпісямі 25 студэнтаў з такім зьместам: „Дырэкцыя Магілёўскага пэдагогічнага інстытуту (дыр. тав. Макоўскі) зусім не цікавіцца бытавымі ўмовамі студэнства. На працягу першага паўгодзьдзя студэнтаў першых трох курсаў тры разы перасялялі з аднаго інтэрнату ў другі. У інтэрнатах нарушаюцца самыя элемэнтарныя правілы санітарыі: памешканьне бруднае, ложкі стаяць адзін каля аднаго, некаторыя студэнты сьпяць па два на ложку, і нават на сталах; німа гдзе рыхтавацца да заняткаў. Камандант інтэр. Берман толькі абяцае пашырыць жыльлёвую плошчу, між тым кожны месяц у студэнтаў адлічываюць 8 проц. са стыпэндыі на жыльлёвае і культурнае абслугоўваньне. Гэтага абслугоўваньня мы ня бачым."

„Звязда" № 8 з дн. 9.1.35 г. друкуе справаздачу сваей Рэйдбрыгады (у ліку 20 асоб), якая праверыла сем сталовак навучальных установ горада Менска. Рэйд-брыгада сьцьвердзіла, што ў большасьці сталовак „Становішча як у адносінах санітарыі і гігіены, так і якасьці абедаў зусім нездавальняючае...

Возьмем сталовую Вышэйшага Пэдагогічнага Інстытуту. Гэтая сталовая абслугоўвае таксама студэнтаў інстытуту савецкага права і аўтадарожнага рабфаку. Калі знаёмімся з гэтай сталовай, дык зразу кідаецца ў вочы яе антысанітарнае становішча. У куткох сьцен вісіць павуціньне. Фіранкі даўно згубілі свой звычайны колер. Афіцыянткі ходзяць у брудных халатах. Падлога, відаць, мыецца вельмі і вельмі рэдка.

У сталовай Б.Д.У. (Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту) становішча яшчэ горшае. Сталы на кухні забруджаныя. Мясарубка брудная. Начыньне мыецца ў халоднай вадзе. Кухэнныя катлы і тэрмасы непалуджаны. Мяса рубяць на брудным даўно нячышчаным стале. Сталовую наведваюць розныя людзі, якія ні маюць да яе ніякага дачыненьня. Яны карыстаюцца бачкамі, з якіх потым, не памыўшы, падаюць абеды студэнтам.

У сталовай № 1 палітэхнічнага інстытуту хлеб рэжуць у цеснай і бруднай каморцы. У кладовай для хаваньня прадуктаў шмат сьмяцьця; некаторыя прадукты, як мяса, ляжаць непакрытымі.

У сталоўцы № 2 палітэхнічнага інстытуту можна знайсьці шмат запісак санурача, у якіх адзначана антысанітарнае становішча сталовак. Аднак указаньні санінспэкцыі не рэалізаваны...

У сталовай — вышэйшага пэдагагічнага інстытуту гатовяцца абеды зусім нізкай якасьці. Меню заўсёды стандартнае: боршч-бручка, боршч-кукуруза.

Вельмі нізкая якасьць страў у сталовай Б.Д.У. Часта падаюць боршч з недаваранай бульбай. Штодзённы госьць у сталовай — ячная каша з вельмі падазроным пахам. Вячэру для студэнтаў не рыхтуюць, а сьнеданьне выдаюць заўсёды са спазьненьнем, і студэнт не пасьпявае яго есьці.

Можна сказаць, што некаторыя людзі пастаўленыя на работу ў студэнскіх сталовак злачынна псуюць каштоўны прадукт.

У сталовай вучэбнага камбінату сувязі стандартныя абеды ўвайшлі ў сыстэму. Повар Клімовіч не задумваецца аб тым, каб даваць разнастайнае меню. Каша бульбяная і суп гарохавы — гэтыя стравы можна кожны дзень убачыць у меню сталовай. Ёсьць усе магчымасьці арганізаваць сьнеданьні для студэнтаў, але ніхто аб гэтым не клапоціцца. А сталовая гэтая абслугоўвае каля 750 чалавек.

Студэнты патрабуюць хуткага добрага абслугоўваньня. Яны ня могуць траціць гадзіны на чаканьне ў чаргах. Між тым, каб атрымаць абеды у сталовай інстытуту, трэба прастаяць гадзіну ў касе, ня менш таго каля стала.

У сталовай Вышэйшай Камуністычнай Сель-гаспадарскай школы студэнты трацяць на абед таксама ня менш гадзіны.

У сталовай аўтадарожнага тэхнікуму бываюць часта выпадкі, калі адна афіцыянтка абслугоўвае 250 чалавек, а па выходных днях касіра замяняюць самі студэнты.

У сталовай вышэйшага пэдагагічнага інстытуту лічаць зусім нармальным зьявішчам, калі студэнт траціць на абед 2—3 гадзіны свайго часу. Пры нашым абследаваньні—кажуць сябры рэйд-брыгады — выяўлены таксама факты абважваньня студэнтаў пры выдачы хлеба на абед.

У сталовай вышэйшага пэдагагічнага інстытуту не даважвалі па 25 грамаў на кожную порцыю. Памножце гэтую лічбу на 1200 (колькасьць наведавальнікаў), дык атрымаецца, што кожны дзень не дадавалася звыж 25 кілёгр. хлеба."

Зьмешчаныя ў перадрукаваным з савецкай прэсы матар'яле факты з жыцьця савецкага студэнства Сав. Беларусі — гавораць самі за сябе, не патрабуюць ад нас комэнтараў.

Ц—ы.

Рэдакцыйная Калегія «Студэнскай Трыбуны» ў складзе: А. Дасюкевіч, Я. Малецкі і С. Коўш.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič